# **САННІКАЎ Андрэй Алегавіч**



Нарадзіўся 8 сакавіка 1954 г. у Мінску.

З залатым медалём скончыў школу, у 1977 г. — Мінскі Дзяржаўны інстытут замежных моў (з адзнакай). Валодае беларускай, рускай, англійскай, французскай, польскай мовамі.

Працаваў на Мінскім заводзе ім. В.І.Казлова, перакладчыкам у нафтавай кампаніі ў Пакістане, на будаўніцтве алюмініевага завода ў Егіпце, у Таварыстве дружбы з замежнымі краінамі, у сакратарыяце ААН у Нью-Ёрку.

Пасля заканчэння ў 1989 г. Дыпламатычнай акадэміі МЗС СССР у Маскве (з адзнакай) А.А.Саннікаў працаваў у МЗС БССР, затым Рэспублікі Беларусь. Напачатку 1995 г. стаў намеснікам Міністра замежных спраў Беларусі. У 1996 г. сышоў у адстаўку.

У 1997 г. А.А.Саннікаў стаў адным з ініцыятараў грамадзянскай ініцыятывы «Хартыя'97». У 1998—2002 гг. — рэктар Народнага ўніверсітэта, незалежнага адукацыйнага праекта.

Лаўрэат міжнароднай прэміі ім. Бруна Крайскі ў галіне праў чалавека (2005 г.), каардынатар грамадзянскай кампаніі «Еўрапейская Беларусь», прафесійны дыпламат, мае ранг Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь. Зараз працуе палітычным аглядальнікам газеты «Народная Воля».

Мае двух сыноў. Жонка — Ірына Халіп, журналістка.